# ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ МАЛАДОЙ ЛІТАРАТУРЫ

**К. А. Тарасава**
*БДУ (Мінск)*
*Навук. кіраўн. – Н. В. Кузьміч, канд. філалаг. навук, дац.*

**Анатацыя.** У матэрыяле зроблена спроба выявіць асноўныя тэндэнцыі развіцця маладой беларускай літаратуры. Пазначаны праблемы ўтварэння новага літаратурнага пакалення, прапанаваны варыянты іх вырашэння.

**Ключавыя словы:** маладая літаратура; літаратурны працэс; эстэтычная дамінанта.

Літаратурны працэс як прагрэсіўная з’ява можа развівацца толькі пры з’яўленні ў ім новых аўтараў і твораў. Так, на сённяшні дзень у Рэспубліцы Беларусь выдаецца каля 670 найменняў кніг мастацкай літаратуры ў год, сярод якіх толькі 16 – кнігі або імёны новых аўтараў (падлік зроблены па дадзеных з электронных рэсурсаў [1; 2]). Гэта паказвае на некаторыя праблемы ў развіцці маладой літаратуры. Каб іх вырашыць, неабходна сістэмна падыйсці да выяўлення працэсаў, якія адбываюцца ў новым літаратурным пакаленні. Гэта дапаможа знайсці эфектыўныя спосабы рэагавання на існуючыя праблемы, што мы і паставілі мэтай дадзенага даследвання.

Паводле дадзеных прэміі “Дэбют” імя Максіма Багдановіча за 2014–2020 гады, з кожным сезонам колькасць удзельнікаў прэміі змяншаецца. Так, у 2020 годзе яна была перанесена на наступны год з-за недахопу твораў. Звяртаючы ўвагу на дадзеныя Табліцы 1 (статыстыка Нацыянальнай кніжнай палаты і прэміі “Дэбют” імя Максіма Багдановіча), можна сказаць, што сярод новай літаратуры на сённяшні дзень адбываецца пэўны заняпад. Сярэдні ўзрост дэбютантаў 28–30 гадоў, што адрозніваецца ад папярэдніх гадоў, дзе літаратурны дэбют прыходзіўся ў сярэднім на ўзрост да 25 гадоў.

***Табліца 1*** **– Статыстыка выдадзеных кніг**

| Год | Агульная колькасць выдадзеных кніг | Колькасць дэбютных кніг | Колькасць дэбютных кніг, выдадзеных за кошт выдавецтва | Сярэдні ўзрост аўтараў-дэбютантаў |
|---|---|---|---|---|
| 2019 | 682 | 16 | 7 | 30 |
| 2018 | 670 | 17 | 5 | 28 |
| 2017 | 635 | 17 | 4 | 29 |
| 2016 | 569 | 19 | 4 | 30 |
| 2015 | 654 | 11 | 3 | 30 |
| 2014 | 1733 | 18 | 5 | 29 |

У сваім развіцці новае літаратурнае пакаленне сутыкаецца з наступнымі праблемамі. Па-першае, сіндром “адкрытага мікрафона” – магчымасць рэалізаваць свае тэксты на вольных пляцоўках прасторы Internet, дзе аўтар атрымлівае зваротную сувязь з чытачом, не ўваходзячы ў літаратурны працэс. Да такіх рэсурсаў адносяцца “Кніга фанфікаў” (ficbook.net), “ЛітРэс” (litres.ru), “Самвыдат” (selfpub.ru), MyBook, “Вершы.ru”, старонкі ў сацыяльных сетках і інш. Пляцоўкі такога кшталту дазваляюць аўтарам размяшчаць свае тэксты без рэдактуры, цэнзуры і крытычнай праўкі, што, з аднаго боку, дазваляе развівацца творчай індывідуальнасці, а з іншага – не адасабляе добрыя творы ад не вельмі якасных і спрыяе развіццю графаманства, разам з гэтым дэматывуючы аўтараў да выдання ўласнай кнігі. Па-другое, назіраецца раз’яднанасць эстэтычных канонаў. У сучасным літаратурным працэсе паспяхова суіснуюць прадстаўнікі пакалення “Тутэйшых”, аўтары, выхаваныя ў часы “Бум-бам-літу”, і інш. Такая раз’яднанасць эстэтычных і тэматычных дамінант уплывае на ўспрыманне літаратуры маладым пакаленнем. Працэс пераемнасці не можа сфарміравацца з-за вялікай колькасці рэцыпіентаў. Трэці пункт вынікае з папярэдняга: адсутнасць уласнай эстэтычнай дамінанты літаратурнага пакалення. Гэта звязана з сусветнай тэндэнцыяй эгацэнтрызму ў літаратуры, які пачаў праяўляцца на нашай літаратурнай прасторы яшчэ ў часы існавання “Бум-бам-літу”, калі аўтарам было ўласціва замыкацца на ўласнай творчасці, а сама літаратура перш за ўсё разглядалася як сродак самарэалізацыі. На сённяшні дзень гэтая тэндэнцыя выяўляецца ў няздольнасці пакалення стварыць сваё аб’яднанне або маніфест. У аснову творчасці ўбудоўваюцца эстэтычна-тэматычныя дамінанты мінулых пакаленняў – для кожнага аўтара свае. Так, у сённяшняй маладой літаратуры актыўна развіваюцца напрамкі гістарычнай і фантастычнай літаратуры, а спосабы выяўлення ідэі аўтара могуць быць арыентаваны як на сярэдняга, так і на элітарнага чытача. Чацвёрты пункт, на які трэба звярнуць увагу, гэта ўзровень дамінанты. Такое рэзкае павышэнне “дэбютнага” ўзросту часцей за ўсё звязана з негатоўнасцю аўтара друкавацца менавіта зараз, неадпаведнасцю яго творчасці ўласным эстэтычным канонам. З-за немагчымасці аб’ядначца маладыя літаратары параўноўваюць сваю творчасць не з прадстаўнікамі таго ж пакалення, а з творамі сталых пісьменнікаў, што запавольвае працэс уваходжання ў літаратуру. Часам на гэта ўплывае і інфантылізм новага пакалення, што можна заўважыць і на выбары аўдыторыі, усё часцей ёй становяцца падлеткі. Пяты пункт – уласна стаўленне пакалення да літаратурнай дзейнасці. Ведаючы сусветную практыку, маладыя творцы не імкнуцца рэалізаваць сябе ў літаратурным працэсе, бо гэта не можа стаць іх асноўнай дзейнасцю. Большасць пачынаючых аўтараў успрымаюць літаратуру як хобі. Тут жа варта зазначыць, што пісьменніцкая дзейнасць не толькі не прыносіць матэрыяльных выгод, але і часта вымагае выдаткаў. На

фоне гэтага развіццё беларускай літаратуры можа вельмі запаволіцца ў будучым, але ў некаторай ступені і паспрыяць нараджэнню новых мастацкіх плыняў. Пакаленне без маніфесту не зможа даць падмурак сваім пераемнікам, а значыць яны, у сваю чаргу, будуць вынаходзіць яго самастойна. Але гэта не пазбаўляе літаратурны працэс іншых складанасцей. Для іх вырашэння можна разглядзець наступныя варыянты.

Сіндром “адкрытага мікрафона” ўзнікае з-за жадання, але немагчымасці праявіць сваю творчасць адкрыта рэальнаму чытачу. Напрыклад, у сярэдняй школе, калі настаўнік рускай або беларускай мовы даведваецца пра здольнасці вучня ў літаратуры, то нярэдка імкнецца выкарыстаць іх на карысць школы: на конкурсах, канцэртах, святах. Гэта ў сваю чаргу можа спрыяць фальсіфікатарскай творчасці – творчасці для нагоды, з наступнай узнагародай, якую сапраўдны літаратурны працэс дае рэдка, або дэматывавацьсапраўднае творчае памкненне. Альтэрнатыўным варыянтам працы з такімі вучнямі можна прапаноўваць разбор твораў, размову з вучнем асабіста пра яго творчасць, бо публічнасць спачатку таксама можа служыць дэматыватарам. Размовы такога кшталту не павінны насіць абавязковы характар і значна ўплываць на эстэтычна-тэматычнае ўспрыманне творчасці цалкам. Лепшым варыянтам стане не праўка, а прапанова альтэрнатыўных варыянтаў, з якімі вучань можа не пагадзіцца без наступстваў для сябе.

Праблема раз’яднанасці эстэтычных канонаў на сённяшні дзень вырашаецца некалькімі спосабамі. Першы: стварэнне пры бібліятэках і школах літаратурных гурткоў, азнаямленне іх удзельнікаў з тэорыяй літаратуры і сучасным літаратурным працэсам. Другі: стварэнне літаратурных школ з непасрэдным уключэннем у літаратурны працэс, дзе пісьменнік-выкладчык выхоўвае прыкладна аднолькавыя эстэтычныя погляды ва ўсіх навучэнцаў, а гэта ў далейшым можа паспрыяць і стварэнню літаратурных аб’яднанняў, творчых маніфестаў. Гэтыя ж школы дапамагаюць вылучыць найбольш таленавітых творцаў, бо вучні туды бяруцца на аснове адбору і ў выніку ім даюць магчымасць выдаць уласную кнігу. На сённяшні дзень такімі школамі з’яўляюцца “Школа маладога пісьменніка”(ШМП) пры Саюзе беларускіх пісьменнікаў, “Школа крэатыўнага пісьма Адама Глобуса” пры беларускім ПЭН-цэнтры, школа пісьменніцтва “W/Rights” пры Саюзе беларускіх пісьменнікаў, штомесячныя школы маладога літаратара пры Саюзе пісьменнікаў Беларусі.

Праблема са статусам пісьменніка можа быць вырашана дзякуючы школьнай праграме, дзе ёсць магчымасць паказаць значнасць і неабходнасць пісьменніка ў грамадстве. Такі крок паспрыяе больш сур’ёзнаму стаўленню да самога працэсу напісання твора. Матэрыяльны бок пытання, як можна бачыць у Табліцы 1, на сённяшні дзень вырашаецца, дзякуючы выданню кніг за кошт

бюджэту выдавецтваў. Так, сваю першую кнігу можна бясплатна выдаць у выдавецтве “Мастацкая літаратура”, Выдавецкім доме “Звязда”, выдавецтве “Кнігазбор”, а з некаторага часу і ў выдавецтве “Пфляўмбаўм”. Паспрыяе больш актыўнаму друкаванню маладых аўтараў і матэрыяльнае заахвочванне з боку выдавецтваў.

Такім чынам, на сённяшні дзень маладая літаратура Беларусі знаходзіцца на этапе паслядоўнага магчымага заняпаду, які можна не дапусціць пры аб’яднанні прадстаўнікоў старэйшых літаратурных пакаленняў, настаўнікаў і выдаўцоў у заахвочванні маладых аўтараў да самарэалізацыі і адэкватным ацэньванні сябе ў літаратуры.

**Літаратура**

1. Нацыянальная кніжная палата Беларусі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://natbook.org.by/index.php?id=13. – Дата доступу: 29.02.2020.
2. Прэмія “Дэбют” імя Максіма Багдановіча [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://pen-centre.by/debut.html/. – Дата доступу: 29.02.2020.